**Андрыеўская, А.** Герой майго горада / А. Андрыеўская // Ленінскі сцяг (Лепель). — 1989. — 4 ліп. — С. 3.

## ГЕРОЙ МАЙГО ГОРАДА

Я стаю ў нашым школьным музеі. Перада мной фотаздымкі тых, хто з'яўляецца гонарам нашай школы. Якія прыемныя, з запалам усмешкі, ззяючыя вочы! Чым падобны яны адзін на аднаго? Адкрытыя твары людзей, жыўшых у розныя часы, але аднолькава падставіўшых сваеплечы ў цяжкія для краіны моманты.

Выпускнік СШ № 2 1982 года Ігар Салаўёў. Яго фотаздымак выдзяляецца сярод іншых выпускнікоў. Ён у чорнай жалобнай рамцы. Прыгожы ўдумлівы твар, тонкія дугі чорных броваў, прамы нос, пунсовыя вусны. Цёмныя валасы акуратна падстрыжаны і ўкладзены. Чорны пінжак і гальштук, белая кашуля. Уся знешнасць, здавалася б, простая, звычайная, нічым не адрозніваецца ад іншых. Але ж якіявочы! Праніклівыя, западаючыя ў душу! Такіх я яшчэ не сустракала. Праніклівыя, прабіраючыя наскрозь, яны прымушаюць думаць аб чысціні душы, аб тым, што ўзвялічвае чалавека над іншымі. Ігар выканаў свій абавязак да канца, абавязак воіна-інтэрнацыяналіста, хоць і каштавала яму гэта дарагой, невымернай цаны, самага дарагога на свеце – жыцця. Жыцця, якое толькі яшчэпачыналася, якое раскрывала першыя, зусім юныя пялёсткі

Як хараша піша пра яго Штэйнгарт, лепельскі паэт:

*Мне на память пришёл*
*мой сосед-паренёк,*
*Что уже невернется с Афгана...*
*І победу уже*
*предвкушали враги,*
*Он один, и подмоги не видно.*
*Жаль, что коротки были*
*парнишкины дни.*
*Умереть в девятнадцать – обидно.*
*Но не дрогнула в миг*
*тот последний рука,*
*Был тот миг и печален и светел.*
*Не оставил в живых*
*ни себя, ни врага*
*Мой сосед вот из «этих».*

Што ж гэта быў за чалавек? Было іх двое ў сям'і: старэйшы – Ігар, малодшы – Алег. Абодва ў дзяцінстве цёмнагаловыя, з яснымі вачамі хлапчукі. Бестурботныя, яны радаваліся ўсяму, што іх акружала: і аксамітнай траве, па якой бегалі басанож, і сінему небу, па якому плывуйь мудрагелістыя баранчыкі – хмаркі. Ігар яшчэ і не здагадваўся, што менавіта з гэтага пачынаецца іх любоў да Радзімы. Гэта глыбокае пачуццё будзе з ім заўсёды: і ў школе, і на заводзе, і ў Афганістане. Яно заўсёды будзе адчувацца і ў яго пісьмах: «...Так, сёння ноччу я бачыў і адчуваў дождж. Гэта першы дождж, які выпаў за паўгода. Я выскачыў з машыны і, як ідыёт, радаваўся даждж. Тут усе, хто ў гэтую ноч начаваў у парку, радаваліся гэтай падзеі, таму што ён нам

напомніў аб Радзіме». Або: «...Мама, як я сумаваў па табе. Мы з табой не бачыліся ўжо паўгода! Як хутка ляціць час...».

Ігар рос выдатным, нераспушчаным хлопцам. Сталеў, набіраўся сіл і розуму, быў заўсёды таварыскі і працалюбівы. Усё шырэй станавілася кола яго інтарэсаў, усё больш набываў добрых сяброў, якіх любіў ён і якія любілі яго. Ён вельмі палюбіў музыку. У яго пакоі па сённяшні дзень вісяць выразкі з часопісаў любімых ансамбляў і артыстаў. Ды і сам Ігар вельмі добра іграў на гітары і спяваў. І зараз памятаюць яго песню на заводзе, якую ён там выконваў у час канцэрта. Заканчваючы школу, Салаўёў цвёрда вырашыў прадоўжыць вучобу. Гэта была яго самая запаветная мара. Але не вытрымаў конкурснага экзамена і пайшоў працаваць на экскаватарарамонтны завод. А потым – армія. Служба закінула яго спачатку ў пяскі Казахстана, а потым – у Афганістан, дзе ён стаў разведчыкам, і адкуль яму ўжо не суджана было вярнуцца…

Невялікі стос пісем ляжыць перада мной. Усяго дванаццаць ён паспеў напісаць адтуль. Але што гэта за пісьмы! Калі б вы іх бачылі і пачыталі! Кожнае з іх дыхае вялікай любоўю і пяшчотай, кожнае напоўнена напоўнена цяплом і святлом, клопатам аб родных, аб таварышах. «Прывітанне з Кундуза!» — так пачынаў ён іх, каб падбадзёрыць родных, каб паказаць свой добры настрой і здароўе, каб дома не хваляваліся. Няма ніводнага такога пісьма. дзе б Ігар не звяртаўся з сыноўняй любоўю да маці і бабулі: «Як тваё здароўе, мам? Ці баляць ногі? Ты глядзі, пішы мне аб усім. Абавязкова пацалуй за мяне бабулю. Я вельмі рады, што яна справілася са сваімі хваробамі». Там, у Кундузе, ён не забывае аб сваей любімай настаўніцы Е. А. Рыўкінай, піша малодшаму брату: «Алег, павіншуй абавязкова Еўдакію Аляксандраўну з новым навучальным годам, перадай мае віншаванні. Калі зможаш, вазьмі яе адрас». Няма ніводнага пісьма, дзе б ён не даў слушнай парады бацьку або брату Алегу. У апошнім сваім пісьме Ігар піша: «Наступіла восень. Алег ужо вучыцца, у яго зараз шмат клопатаў. Гэта у яго апошні этап школьнага навучання. Алег! Мая табе парада: вучыся як мага лепш, ад гэтага ж залежыць тваё будучае».

Гэта была яго апошняя парада. Ён і сам пасля арміі збіраўся прадоўжыць вучобу. Але не давялося яму ажыццявіць сваю мару.

...Пайшлі ў разведку ўпяцёх. Пайшлі, і ніхто з іх не вярнуўся, у тым ліку і Ігар..

Няма яго цяпер побач з намі, але засталася вялікая і светлая памяць аб ім. Засталася, затаілася надзея ў сэрцы маці, якая так і не змагла ўявіць сабе смерць сына. Яна чакае, чакае, як і іншыя маці, хоць ведае што немагчыма гэта вяртанне. Засталася магіла з помнікам на лепельскіх могілках. Яе заўсёды ўпрыгожваюць рознакаляровыя кветкі. Сюды часта прыходзяць родныя, таварышы, вучні, настаўнікі.

Мы ніколі не забудзем цябе. Ігар!

**А. Андрыеўская**